28 кастрычніка — 80 гадоў Міхасю Даніленку



# Гаючы водар роднай зямлі

Як дарагую рэліквію захоўваю трохтомнічак паэзіі А. С. Пушкіна, выдадзены "Советским писателем" да 150-годдзя з дня нараджэння паэта. На тытуле — падарункавы надпіс: "У памяць аб Другім з'ездзе пісьменнікаў Беларусі: М. Даніленка — Хв. Жычку. Мінск, 1 чэрвеня 1949 года".

У фае клуба імя Дзяржынскага, дзе праходзіў з'езд, мы куплялі і дарылі адзін аднаму лепшыя выданні таго часу, дарылі чужыя кнігі, бо сваіх яшчэ не мелі: не былі членамі Саюза пісьменнікаў, на з'ездзе прысутнічалі з гасцявымі запрашальнымі білетамі. З цікавасцю і захапленнем глядзелі на "жывых" любімых са школьных дзён пісьменнікаў: Якуба Коласа, Янку Маўра, Пятра Глебку, Міхася Лынькова, Канстанцыю Буйло, Петруся Броўку, Аркадзя Куляшова.

Міхась Даніленка тады настаўнічаў у Казярожскай школе Лоеўскага раёна, а я служыў на Балтыйскім флоце. Нашы творы зрэдку друкаваліся на старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў. З той пары і сябруем. Вось ужо больш за паўстагоддзе перапісваемся, зрэдку сустракаемся ў Мінску ці ў Гомелі, дзелімся навінамі і задумамі, абменьваемся кніжкамі — ужо сваімі.

Трыццаць гадоў Міхась Пятровіч Даніленка адпрацаваў у рэдакцыі газеты "Гомельская праўда", па заданнях рэдакцыі скалясіў усю вобласць. Колькі ўражанняў, колькі сустрэч з цікавымі людзьмі — рабочымі, сялянамі, воднікамі, студэнтамі, настаўнікамі, нафтавікамі!.. Напісана пра іх мноства карэспандэнцый, артыкулаў, заметак і інфармацый. А самыя цікавыя ўражанні леглі ў аснову мастацкіх твораў — апавяданняў, аповесцей і нарысаў, сабраных потым у кнігі "Мая песня", "Майская навальніца", "Наваселле", "Наш дом", "Запаветны акіян", "Маці Мар'я", "Журлівіца", "Родная зямля" і іншыя. Кнігі цікавыя і праўдзівыя.

Міхась Пятровіч піша пра тое, што ведае, і пра тых, каго паважае і любіць, каго разумее сэрцам і душой. Ураджэнец Лоеўшчыны, сялянскі сын, ён з маленства бачыў, якой цяжкай працай здабываецца хлеб, колькі клопатаў патрабуецца чалавеку, каб вырасціць збажыну, бульбу, садавіну і гародніну, выпеставаць маладняк жывёлы і птушак. Таму і героямі яго твораў сталі працавітыя, шчырыя і сумленныя людзі, якіх так любіць пісьменнік. Людзі і зямля, наша родная беларуская зямля. Вось як пра гэта піша М. Даніленка ў апавяданні "Родная зямля": "Усюды, як кінуць вокам, стаіць роўнай сцяной высокая збажына. Часам, калі павее ветрык, праплывуць адна за другой шызаватыя хвалі, праплывуць недзе туды, дзе і канца не відаць гэтаму полю.

І пахне зямля такім да болю знаёмым хвалюючым пахам, якім можа пахнуць толькі родная зямля".

Празаік Міхась Даніленка ніколі не адчуваў недахопу жыццёвага матэрыялу для сваіх твораў. Наадварот, у яго заўсёды не хапала часу рэалізаваць, выкласці на паперу свае задумы, назапашаныя ўражанні.

Недзе на пачатку 70-х гадоў Міхась Пятровіч звярнуўся да ваеннай тэматыкі. Раней гэтую тэму ў творчасці амаль абмінаў — не таму, што майстэрства не хапала. Проста балюча было ўспамінаць сяброў, якім не суджана было дажыць да светлых дзён Перамогі, сяброў, аблічны якіх яшчэ стаялі ўваччу, а галасы ўрываліся ў сны. Лагодны па натуры Міхась Пятровіч цяжка перажывае не толькі кожную страту, але і кожную ростань:

"А я сяджу і думаю.

Дзе ты, Леанід Зайцаў? Можа, ты застаўся служыць у арміі, каб трымаць заўсёды пад рукой зброю, каб мог заўсёды агарадзіць ад магчымых няшчасцяў дзяцінства такіх, як Слаўка?

А ты, Ахмет Хібабулін? Якую аперацыю зрабіў, каб аблегчыць чалавечы боль?

І якая ты цяпер, Марта — мой сонечны праменьчык у той цяжкі час?

І поруч з жывымі я ўспамінаю вас, Нікіфар Лебедзеў і Міхайла Цімчанка, вас, Грыша-мазчык і Апанас Цымбал...

І чым больш праходзіць гадоў, тым часцей Альпы прыходзяць да мяне — то ў сне, то ва ўяўленні сваім бачу іх падрабязна — да маленькай рысачкі".

Так заканчваецца аповесць "Альпы" — шчымлівы расказ пра самыя горкія дні ў жыцці пісьменніка: катаргу ў фашысцкім канцлагеры, куды трапіў кантужаны палонны радавы Даніленка ў маі 1942 года. У змардаваных да знямогі людзей хапіла духу арганізаваць уцёкі і праз непраходныя дзікія аўстрыйскія Альпы дабрацца да сваіх...

А тым, хто яшчэ і сёння па недасведчанасці ці дурасці хоча абяліць фашыстаў (маўляў, ішлі вызваляць ад "калгаснага рабства"), я параіў бы прачытаць апавяданне Міхася Даніленкі "Штраус у апраметнай", у якім так дакладна і выразна паказана сапраўднае звярынае аблічча "гуманнага" гітлераўца.

Як былы настаўнік, не забывае Міхась Даніленка і маленькага чытача. Для дзяцей ён напісаў цікавыя кнігі: "Вернасць слову", "Зачараваны гарлачык", "На вуліцы Сонечнай", "Ключы бабулі Зімы" і інш.

Пасля выхаду на пенсію большую частку свайго часу Міхась Пятровіч праводзіць у роднай вёсцы Багатая Града, дзе ў яго ёсць хата і прысядзібны ўчастак, вядзе няхітрую сялянскую гаспадарку і піша цікавыя творы. Ніколі я не быў ні ў Казярогах, ні ў Багатай Градзе. Але каб трапіў туды, напэўна, сустрэў бы многа знаёмых. Гэта — і мудры дзядуля Лявон Канцавы, і разважлівая, шчырая на працу Аксіння Пракопіха, і яе дачка Вера, і зухаваты заатэхнік Данік з аповесці "Журлівіца" і былая партызанка Бакшыха, ад якой вучні запісалі праўдзівыя расказы пра цяжкае жыццё ў акупацыі, і нашчадкі працавітага лесніка Апанаса Лугавога, і сябры дзяцінства Іван Дзятлаў і Міхась Матрос, якія па сённяшні дзень з болем успамінаюць загінуўшага на фронце аднагодка Казіка Рамашкевіча... Многа цікавых і добрых людзей жыве ў творах Міхася Пятровіча.

Я — не крытык, не ўмею рабіць навуковых аналізаў мастацкіх твораў. Я проста пішу пра свайго даўняга сябра Міхася Пятровіча Даніленку, цудоўнага чалавека і таленавітага пісьменніка, які за 55 гадоў творчай дзейнасці (першае яго апавяданне "Пачастунак" было надрукавана ў лютаўскім нумары часопіса "Беларусь" у 1947 годзе), стварыў цэлую галерэю вобразаў нашых сучаснікаў і пра якога аслепленыя бляскам зіхоткіх лаўрэацкіх значкоў нашы крытыкі не сказалі яшчэ добрага слова. Напярэдадні юбілею шчыра віншую цябе, дружа, хачу падзякаваць за дабротна напісаныя праўдзівыя кнігі і шчыра жадаю моцнага здароўя!

**Хведар ЖЫЧКА,**
г. Мінск.